Упраўленне культуры
Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
УК “Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі”

# LABOR OMNIA VINCIT
## Праца заўсёды перамагае:
## Матэрыяльная культура ў гістарычным кантэксце
## Праблемы вывучэння і захавання

*Матэрыялы навуковай канферэнцыі*

Гродна
ГрДУ імя Янкі Купалы
2022

pawet.net

УДК 902
ББК 63.4
L11

Рэкамендавана Навукова-метадычным саветам установы культуры
“Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі”

Рэдакцыйна калегія:

А. У. Ціхаміраў (гал. рэд.), магістр культуралогіі, загадчык аддзела навукова-даслечай і экспазіцыйна-выставачнай работы ГДМГР;

А. Д. Гаршкоў, магістар гістарычных навук, навуковы супрацоўнік навукова-фондавага аддзела ГДМГР

Рэцэнзенты:

С. А. Піваварчык, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін ГрДУ імя Янкі Купалы;

А. Ф. Касюк, кандыдат гістарычных навук, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі

Labor omnia vincit. Праца заўсёды перамагае: матэрыяльная культура ў гістарычным кантэксце. Праблемы вывучэння і захавання : матэрыялы навуковай канферэнцыі (г. Гродна, 6-7 мая 2021 г.) / УК “Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі” ; рэдкал.: А. У. Ціхаміраў (гал. рэд.), А. Д. Гаршкоў. – Гродна : ГрДУ імя Янкі Купалы, 2022. – 141 с.: іл.

Зборнік прысвечаны актуальным праблемам даследвання матэрыяльнай культуры ў Беларусі. Аўтары закранаюць розныя пытанні археалогіі, гісторыі, музеязнаўства, нумізматыкі, гісторыі мастацтва, іўдаікі і інш.

Разлічаны на гісторыкаў, археолагаў, мастацтвазнаўцаў, супрацоўнікаў музейных устаноў, выкладчыкаў, аспірантаў, настаўнікаў, студэнтаў, а таксама ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі матэрыяльнай культуры ў Беларусі.

УДК 94 (476.5) «653»

Алег Дзярновіч

Інстытут гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук

# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА КРЭЎСКАГА ГАРАДЗІШЧА X — ПАЧАТКУ XIV СТСТ. І ПРАБЛЕМА КРЫТЭРЫЯЎ ПАСЕЛІШЧАЎ РАННЕГАРАДСКОГА ТЫПУ

**Material Culture of the Kreva Hillfort in the 10th – beginning of the 14th Centuries and the Problem of Criteria for Early Urban-Type Settlements**

The process of urbanization as the creation of a network of permanent settlements, a significant part of whose population is employed in the non-agricultural sector, belongs to one of the basic characteristics of social transformations that took place in Eastern and Northern Europe during the 9th and 13th centuries. This process was asynchronous. In Eastern Europe in the first half of the 11th century, ancient Rus' cities were already a fully formed socio-economic and political-administrative phenomenon. In the territory of "historical Lithuania" the processes of urbanization in its initial stage are not recorded in written sources. We have recollections of most political and administrative centers in "historical Lithuania" only from the end of the 14th century - in ancient Ruthenian and German Order narrative sources.

But archaeological research over the past 20 years in the territory of "eastern Lithuania" (historical Vilnia / Vilnius Voivodeship) has made a real breakthrough in the study of non-agrarian settlements. Taking into account the characteristics of the material culture and the fortification features of the settlement, it can be argued that the original Kreva has the features of an early urban type settlement. Another hypothesis can be formulated -- the early urbanization in Eastern Lithuania is associated with the process of expanding the Slavic trade and craft presence in these centers.

It is worth considering the introduction / return of the definition of the *Proto-city* in relation to the earliest stage of formation of administrative and organizational centers of Eastern Lithuania in the tenth and twelfth centuries.

## 1. Крэўскае гарадзішча

На працягу 2013—2014 і 2017—2020 гг. праводзілася археалагічнае вывучэнне Крэўскага гарадзішча і тэрыторыі вакол яго (меркаванага селішча). Гарадзішча мае авальную форму 40 х 20 м, вышынёй 20 м, земляныя валы вышынёй 5 м акружаюць усю ўнутраную пляцоўку дзядзінца (Іл. 1, 2). Плошча гарадзішча складае 4400 кв. м., альбо 0,44 га. Непасрэдна на дзядзінцы былі распрацаваны Раскоп 1 і шурф, агульнай плошчай 64 кв. м.

На гарадзішчы выяўлены пласты канца X — пачатку XIV стст. Можна меркаваць, што да пабудовы мураванага Крэўскага замку менавіта гарадзішча было адміністратыўным і гаспадарчым цэнтрам старажытнага Крэва, якое згадваецца ў нямецкіх ордэнскіх крыніцах. Крэва было вядомае паводле "Die litauischen Wegeberichte" – нямецкага апісання шляхоў выправаў рыцараў Ордэна на Літву, складзенага з 1384 па 1402 г., дзе згадваецца, праўда часам даволі блытана, пра шлях з Гродна на Крэва:

“*Weg von Grodno nach Krewy*” [19, p. 703—704]. Сам жа замак быў пабудаваны на тэрыторыі, на якой не фіксаваліся матэрыялы, ранейшыя за XIV ст. На Крэўскім жа гарадзішчы актыўнае жыццё спынілася як раз у пачатку XIV ст.

Матэрыяльная культура Крэўскага гарадзішча рэпрэзентавана не толькі побытавымі рэчамі, але таксама прадметамі, звязанымі з:

- рамеснай вытворчасцю (матрыца лілеяпадобнай падвескі для караляў (“крыні”) XII—XIII ст. (Іл. 4 : 1) [5, с. 13]; нарыхтоўкі вырабаў з косці;

- гандлем (манетна-вагавая 14-гранная гірка другой паловы X—XI стст. паўночнаеўрапейскай сістэмы (Іл. 4 : 4) [5, с. 14; 8, с. 262—263]; брактэат біцця аднаго з гарадоў нямецкага ордэна ў Прусіі XIV ст. [5, с. 14; 8, с. 263—264]**;** імпартаваныя рэчы (шкляны посуд – фрагмент шкляніцы XII—XIII стст. з гравіроўкай арабскай вяззю “сульс”, на якой прачытваецца надпіс “Ён быў”[8] (Іл. 5); начынне з белагліянай керамікі).

Выяўлены прадметы элітарнага побыту: фрагменты шклянога посуду; упрыгожанні, у прыватнасці, фрагменты расны – вырабу ў выглядзе падвесак.

Што тычыцца прадметаў, якія маюць дачыненне да вайсковай справы, то, апроч наканечнікаў стрэлаў, сярод знаходак Крэўскага гарадзішча маюцца элементы аздаблення ўзбраення і рыштунку каня дружыннага кола: касцяная накладка на калчан XIII ст. (Іл. 3 : 1); металічная накладка на рыштунак каня з эмаллю, XII ст. (Іл. 6, 7).

Пад пытаннем застаецца наяўнасць помнікаў эпіграфікі. На выяўленым фрагменце шыфернага прасліца маюцца накрэсленні, якія можна інтэрпрэтаваць як надпісы-графіці.

Такім чынам, апроч знаходак побытавага прызначэння, на Крэўскім гарадзішчы знойдзены артэфакты, якія ўказваюць на неаграрныя віды дзейнасці ў старажытным Крэве.

**2. Крытэрыі**

Даволі плённая дыскусіі пра крытэрыі вызначэння старажытных гарадоў адбылася ў савецкай археалогіі ў 1980-х гадах. Вынікі гэтай дыскусіі ў пэўным сэнсе былі падсумаваныя Андрэем Кузой, які прапанаваў свой спіс археалагічных крытэрыяў [10, с. 46; 9, с. 51]. Вынікам дыскусіі стала таксама фармаванне канцэпту “малы горад” [9, с. 40—70]. Паселішчы гэтага тыпу вылучаюцца паводле падабенства археалагічных

---

[8] За кансультацыю аўтар выказвае падзяку кітабісту Міхаілу Талерцы.

характарыстык з матэрыяламі з раскопак такіх буйных гарадскіх цэнтраў, як Полацк, Кіеў, Ноўгарад. Дзякуючы гэтаму таксанімічнаму канцэпту стала магчымым аналізаваць неаграрныя паселішчы X—XIII стст. у кантэксце ранніх этапаў урбанізацыі.

Комплекс выяўленых актэфактаў Крэўскага гарадзішча карэлюецца са спісам прыкмет старажытнарускага горада X—XIII стст., прапанаваным у 1985 г. Андрэем Кузой. Размесцім у табліцы крытэрыі горада і адзначым наяўнасць той ці іншай катэгорыі знаходак на Крэўскім гарадзішчы.

| | ***Археалагічныя прыкмета старажытнарускага горада X—XIII стст.*** | ***Наяўнасць на Крэўскім гарадзішчы (пласты X—XIV стст.*** |
|---|---|---|
| **1. Эканоміка** | | |
| | 1-1. рамяство (вытворчыя комплексы, прылады працы, паўфабрыкаты) | + |
| | 1-2. гандаль (прывазныя рэчы, дэталі вагаў, манеты і грашовыя злiткі) | + |
| | 1-3. промыслы (у тым ліку сельская гаспадарка) | + |
| **2.Адміністрацыйнае кіраванне** | | |
| | 2-1. пячаткі і пломбы | - |
| **3. Вайсковая справа** | | |
| | 3-1. зброя | + |
| | 3-2. даспехі | - |
| | 3-3. рыштунак каня і вершніка | + |
| **4. Манументальнае дойлідства** | | |
| | 4-1. каменныя храмы | - |
| | 4-2. грамадзянскія каменныя збудаванні (каменныя | - |

| | | |
|---|---|---|
| | палацавыя і абарончыя збудаванні) | |
| **5. Пісьменнасць** | | |
| | 5-1. помнікі эпіграфікі | **(+)** |
| | 5-2. прылады пісьма | **-** |
| | 5-3. кніжныя зашпількі і накладкі | **-** |
| **6. Побыт феадалаў (эліты)** | | |
| | 6-1. прадметы баярска-княскага параднага ўбору (упрыгожанні з каштоўных металаў) | **+** |
| | 6-2. металічны і шкляны посуд, іншае дарагое начынне | **+** |
| **7. Унутраная тапаграфія** | | |
| | 7-1. умацаванні складанага плану | **-** |
| | 7-2. умацаванні простага плану | **+** |
| | 7-3. сядзібна-дваровая забудова | **?** |
| | 7-4. дыферэнцыяцыя жылых пабудоў па месцазнаходжанні, памерах і функцыях | **(+)** |

**Табліца 1. Суадносіны крытэрыяў старажытнарускага гораду з артэфактамі Крэўскага гарадзішча**

Супадзенні маюцца ў наступных пазіцыях:

1. Эканоміка: 1) рамяство (вытворчыя комплексы, прылады працы, паўфабрыкаты); 2) гандаль (прывазныя рэчы, дэталі вагаў, манеты і грашовыя злiткі); 3) промыслы.

3. Вайсковая справа: 1) зброя; 3) рыштунак каня і вершніка.

5. Пісьменнасць: 1) помнікі эпіграфікі (?).

6. Побыт феадалаў: 1) упрыгожанні з каштоўных металаў; 2) металічны і шкляны посуд, іншае дарагое начынне.

7. Унутраная тапаграфія: 7-2. умацаванні простага плану; 7-4. вельмі асцярожна можам казаць пра дыферэнцыяцыю ў Крэве жылых пабудоў па месцазнаходжанні, памерах і функцыях (маецца на ўвазе выяўленыя прыкметы асобных майстэрань). Па ўнутранай тапаграфіі на дадзены момант мы маем недастаткова звестак.

Адсутнічаюць такія такія пазіцыя, як адміністрацыйнае кіраванне (пячаткі і пломбы) і манументальнае дойлідства. Адносна перспектыў выяўлення помнікаў манументальнага дойлідства адразу адзначым, што перспектыў іх выяўлення няма. Як уяўляецца, усе пабудовы ў Крэве X—XIII ст. былі драўлянымі. У 1387 г. у Крэве быў заснаваны, паводле храніста Яна Длугаша, касцёл сярод сямі іншых у паганскай Літве: "Fundat insuper septem parochiales ecelesias in locis oportunis et necessariis, videlicet in Volkmaria, Misyohola, Nyemczani, Myedniki, Crewa, Obolcze et Hayna, item prebendam sancti Martini in castro Vilnensi alciori" [16, s. 163]. Выглядае, што гэты касцёл мог знаходзіцца ў ваколіцах гарадзішча, і можна меркаваць, што ён быў драўляны.

Такім чынам, па сукупнасці археалагічных прыкметаў Крэва X — пачатку XIV стст. мае характар паселішча неаграрнага тыпу.

**3. Тыпалогіі неаграрных паселішчаў сярэднявечча**

Якія ж тыпы неаграрных паселішчаў мы можам вылучыць у рэгіёнах Усходняй і Паўночнай Еўропы ў IX—XI стст.?

**3.1. Вікі.** На працягу ўсяго VII ст. адбываўся паслядоўны ўздым эканомікі паўночна-ўсходніх рэгіёнаў Франкскага каралеўства. Тут узніклі гандлёвыя цэнтры, вядомыя пад лацінска-нямецкай назваю ***vicus*** (ням. Wik у значэнне "порт, гавань, затока") [2, с. 15]. Тэрмін у значэнні "гандлёвы порт" замацаваўся не толькі за паўночнымі марскімі прыбярэжнымі паселішчамі, але таксама за гарадамі, вядомымі з рымскай эпохі, як прыгаданы ў Landweric, то бок Лондан [11, с. 222].

Паселішчы тыпу вікі былі складанымі і ўнутрана супярэчлівымі, пераходнымі па свайму характару цэнтрамі сацыяльнай фільтрацыі, канцэнтрацыі і пераразмеркавання каштоўнасцяў у працэсе абароту і развіцця Паўночнага гандлю [18, s. 26—36]. Пры ўсёй невыразнасці структуры, вікі сталі месцамі крышталізацыі якасна новых сацыяльна-эканамічных функцый. Тут канцэнтраваліся гандаль і зараджалася рамяство, развіваліся формы гарадскога самакіравання і права,

фармаваліся новыя грамадскія групы – купцы, рамеснікі, а на пэўным этапе – і раннефеадальны дружынны пласт [2, с. 11—17].

Вікі і структурна блізкія да іх цэнтры развіваліся, шмат у чым адступаючы ад класічнай схемы генезісу ранняга горада: рост земляробчай акругі – уздым земляробства – падзел працы, выдзяленне рамяства – развіццё абмену, вылучэнне гандлю – канцэнтрацыя рамесна-гандлёвых функцый у неаграрных паселішчах [12, с. 140—144].

Заснаваная перш за ўсё на знешніх сувязях гандлёвая функцыя віка папярэднічала яго функцыі як цэнтра развіцця рамяства, што, напрыклад, праілюстравана даследаваннем гісторыі Гедэбю (Хэдебю) [17, s. 161—261]. Сведчаннем гэтага ёсць тое, што на працягу эпохі вікінгаў падобныя паселішчы так і не атрымалі закончанай цэхавай арганізацыі. Таму можна назіраць адсутнасць прамой пераемнасці паміж вікамі IX—XI стст. і ўласна сярэднявечнымі гарадамі Даніі, Нарвегіі, Швецыі. У пэўнай меры можна сцвярджаць, што росквіт вікі ёсць вынікам паходаў вікінгаў, таму што разам з гандлёвым абарачэннем менавіта ваенная здабыча давала ўстойлівую гарантыю функцыянавання падобных цэнтраў.

Даследчык варажскіх старажытнасцяў Глеб Лебедзеў вылучаў наступныя сістэмна звязаныя прыкметы, якія характарызуюць вікі [12, с. 230]:

- у адрозненні ад гарадоў-сталіцаў рэгіянальных ці племянных тэрыторый, вікі размяшчаліся на “нічыйнай зямлі”, на памежжы пляменаў і народаў, што абумоўлівала іх свабоду ад юрысдыкцыі мясцовых уладаў;

- вікі знаходзіліся на важных гандлёвых шляхах, але, як правіла, былі аддалены ад марскога ўзбярэжжа і размяшчаліся ў адносна бяспечных месцах;

- прынамсі на раннім этапе вікі не мелі ўмацаванняў, абарончыя валы ўзводзіліся з працэсам росту насельніцтва; у якасці раннеўрбаністычных “протагарадоў” вікі выступаюць у якасці “адкрытых гандлёва-рамесных паселішчаў”;

- вікі вылучаліся значнай плошчай, якая ў некалькі разоў пераўзыходзіла плошчу сінхронных ім заходнееўрапейскіх гарадоў;

- колькасць насельніцтва ў вікі была не сталай, яна пульсавала ў залежнасці ад гандлёвых сезонаў;

- на раннім этапе сістэма забудовы тэрыторыі вікі заставалася свабоднай, з “плямамі сядзібаў”, але паступова ўшчыльнялася, набываючы рэгулярны характар з элементамі гарадскога добраўпарадкавання (маставыя, набярэжныя, студні і інш.);

- вакол вікі меліся могільнікі з рознымі варыянтамі абрадаў пахавання; гэтыя пахаванні звязаны з прышлым насельніцтвам, якое не валодала правам на зямлю ў акрузе;

- рэчавы матэрыял фіксуе параўнаўча раннія сляды гандлёвай дзейнасці, мясцовая рамяство арганізуецца пазней, на пэўным этапе існавання гандлёвых цэнтраў;

- росквіт вікі абмежаваны VIII—X стст., а на працягу XI ст. яны знікаюць, іх змяняюць заснаваныя ўжо каралеўскай уладай "гарады малодшага тыпу", якія з цягам часу перарастаюць у сярэднявечныя прававыя гарады.

Класічнае вікі мела выхад да мора, хоць не абавязкова мусіла быць размешчаным непасрэдна на яго беразе. Яшчэ адзін падтып гандлёвых паселішчаў IX—XI стст. рэпрэзентуе Гнёздава, размешчанае каля вялікай ракі – Дняпра.

Ад сярэднявечных гарадоў гэтыя гандлёвыя цэнтры адрозніваліся паводле наступных характарыстык [2, с. 15]:

1) зменлівы ў залежнасці ад гандлёвага сезону склад насельніцтва;

2) часовыя формы адмысловых сацыяльных сувязей "гандлёвых людзей";

3) адсутнасць, прынамсі на ранніх этапах развіцця, абарончых умацаванняў;

4) пад час панавання язычніцтва вакол гэтых пасяленняў маюцца вялікія могільнікі з разнастайнымі варыянтамі абрадаў;

5) перыяд функцыянавання абмежаваны IX – пачаткам XI стст., а ў другой палове X ст. пачынаецца заняпад, з сярэдзіны XI ст. падобныя гандлёвыя цэнтры знікаюць, іх змяняюць сярэднявечныя гарады.

**3.2. Адкрытыя гандлёва-рамесныя паселішчы.** Падобную структуру, як скандынаўскія і фрызскія вікі, мае шэраг сінхронным ім заходнеславянскіх паселішчаў (ранні Волін, Менцлін, Ральсвік) [11, с. 231]. Ва Усходняй Еўропе падобны тып паселішчаў рэпрэзентаваны "адкрытымі гандлёва-рамеснымі паселішчамі" (АГРП), якімі былі Ладага другой паловы VIII — першай паловы IX стст., Рурыкава гарадзішча пад Ноўгарадам, Гнёздава пад Смаленскам, Цімерава пад Яраслаўлем [1, с. 139]. Але важна адзначыць, што АГРП ні ў адным з вядомых выпадкаў не стала цэнтрам устойлівых палітычных утварэнняў, княстваў ці земляў. Больш за тое, многія з гэтых паселішчаў увогуле спынілі сваё існаванне (Гнёздава, Цімерава), а некаторыя пераўтварыліся ў гарадскія пасады (Ладага) [1, с. 140]. Такім чынам, атрымліваецца, што функцыянал

гандлёва-рамеснага паселішча не гарантаваў эвалюцыі яго ў сярэднявечны горад. Інтэграцыя прота- і раннегарадскіх паселішчаў у цэльную гарадскую структуру прадугледжвае фармаванне княскага дзядзінцу (замку) ці адміністратыўнага цэнтру, гандлёва-рамеснага пасаду, што прымыкае да гэтага цэнтра.

Назапашванне археалагічнага матэрыялу на працягу 1970—1990-х гадоў, вывучэнне структур старажытных паселішчаў як сістэмы (у тым ліку, паралельнае міждысцыплінарнае даследаванне комплексаў "паселішча – могільнік"), дазволіла скарэктаваць важны тэзіс пра сезонны характар насельніцтва АГРП. Там, дзе матэрыялы дазваляюць рабіць гендарныя падлікі, як у Гнёздава, рэпрэзентатыўнасць у некропалі розных полава-узроставых груп сведчаць не пра "сезонную", а пра сталую і стабільную дэмаграфічную структуру паселішчаў [14, с. 114, 118].

Ключавая сацыяльная характарыстыка АГРП – гэта іх "адкрытасць". Цяпер жа можна сцвярджаць, што за гэтаю "адкрытасцю" стаіць не поўная адсутнасць умацаванняў, але абсалютнае прасторавае і функцыянальнае дамінаванне шырокіх неўмацаваных частак над нязначнымі па плошчы і слабымі ў фартыфікацыйных адносінах гарадзішчамі [14, с. 119]. Падобнае датычыць і паўночна-еўрапейскіх вікі.

Яшчэ адзін феномен, археалагічны і гістарычны, які тычыцца генеалогіі раннегарадскіх паселішчаў, гэта наяўнасць сацыяльна-палітычнага катаклізму як фактару пераўтварэння "гарадкоў" у "горад". Падобным катаклізмам можа быць таксама ўключэнне паселішча ў новую зону ўплыву [14, с. 123]. Такім чынам, маюцца на ўвазе падзеі, якія змяняюць функцыі паселішча і ўмовы яго далейшага развіцця [6, с. 59].

Што тычыцца тэрміналогіі, паводле пецярбургскай даследчыцы Надзеі Платонавай, у адносінах да АГРП варта вярнуцца да паняцця "протагорад", які можна выкарыстоўваць адносна найранейшага этапу станаўлення адміністратыўна-арганізацыйных цэнтраў Пачатковай Русі VIII—IX стст. [14, с. 126].

**3.3. Феадальныя сядзібы-замкі.** Разгляд АГРП выводзіць праблематыку неаграрных паселішчаў у сацыяльную плашчыну. Існуе таксама ракурс аналізу паселішчаў з пункту гледжання наяўнасці ці адсутнасці абарончых збудаванняў. Умацаваная частка паселішчаў X—XIII стст. у археалагічнай тэрміналогіі мае вызначэнне "гарадзішча". У сваю чаргу ўжо гарадзішчы могуць рэпрэзентаваць розныя сацыяльна-культурныя тыпы паселішчаў [7, с. 50; 13, с. 93]:

1. гарадзішчы-сховішчы і свяцілішчы (X—XII стст.);

2. абшчынныя адміністратыўныя цэнтры (X—XIII стст.), на якіх у пэўны перыяд маглі ўзнікнуць невялікія феадальныя двары;

3. феадальныя сядзібы-замкі (узнікаюць на мяжы XI—XII стст.);

4. уласна малыя гарады (з сярэдзіны – другой паловы XII ст.).

Асобнае месца ў спісе гэтых “гарадзішчаў” займаюць феадальныя сядзібы-замкі. Гэты тып паселішчаў прыгадваецца ў летапісных крыніцах пад тэрмінамі «дом», «двор», «град» [4, с. 266]. Характэрнай асаблівасцю феадальнай сядзібы было спалучэнне магутных абарончых збудаванняў з невялікімі памерамі ўмацаванай плошчы, наяўнасць сярод археалагічных знаходак зброі і прадметаў, звязаных з ваенным побытам [3, с. 43—44]. У археалагічных матэрыялах феадальных замкаў выразна прасочваюцца прыкметы маёмаснай дыферэнцыяцыі, знойдзены дарагія імпартныя замежныя рэчы. Але, як правіла, адсутнічаюць сляды развітой рамесніцкай вытворчасці.

**3.4. Этапы ўрбанізацыі** паводле А. Кузы [10, с. 51; 9, с. 165—166] маюць наступную храналогію:

1) ранні перыяд, які доўжыўся на працягу X – пачатку XI стст. і на працягу якога “малыя гарады” яшчэ не крышталізаваліся ў спецыфічны тып гарадскіх паселішчаў;

2) на перыяд XI – першай паловы XII стст. прыпадае пашырэнне геаграфіі горадаўтваральных працэсаў і фармаванне іерархічнай структуры гарадскіх цэнтраў;

3) на перыяд сярэдзіны XII – сярэдзіны XIII стст. прыпадае эпоха пачатку развітых феадальных гарадоў.

Для Полацкай зямлі ў IX – пачатку X стст. Георгій Штыхаў вылучаў перыяд прагорада, альбо протагорада – паселішчаў пераходнага тыпу, якія пры наяўнасці адпаведных умоваў у далейшым сваім развіцці маглі стаць горадам у сацыяльна-эканамічным яго разуменні [15, с. 2—3]. Для протагорада была характэрнай наяўнасць невялікай умацаванай часткі пры адсутнасці значнага пасадскага паселішча, абмежаваная колькасць функцый у параўнанні з горадам, які вырастае на яго аснове.

## 4. Заключэнне

Працэс урбанізацыі як стварэнне сеткі сталых паселішчаў, значная частка насельніцтва якіх занятая ў неаграрным сектары, належыць да адной з базавых характарыстык сацыяльных трансфармацый, якія адбываліся ва Усходняй і Паўночнай Еўропе на працягу IX—XIII стст. Працэс гэты быў асінхронным. Ва Усходняй Еўропе ў першай палове XI ст. старажытнарускія гарады выступаюць ужо як цалкам афармленая

сацыяльна-гаспадарчая і палітычна-адміністратыўная з’ява. З гэтага перыяду назіраецца ўзрастанне сведчанняў і дакладных супадзенняў археалагічных фактаў і звестак пісьмовых крыніц. Для папярэдняга перыяду гэтыя супадзенні рэдкія і асноўнымі, а часам і выключнымі, з’яўляюцца менавіта археалагічныя сведчанні.

На тэрыторыі “гістарычнай Літвы” (балцкага этнічнага рэгіёну, які ў сярэдзіне XIII – XIV стст. стаў ядром ВКЛ) працэсы ўрбанізацыі ў пачатковай яе стадыі пісьмовымі крыніцамі не фіксуюцца. Мы маем згадкі аб большасці палітычных і адміністратыўных цэнтраў у “гістарычнай Літве” толькі з канца XIV ст. – у старажытнарускіх (“Спіс рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх”) і нямецкіх ордэнскіх наратыўных (“Die litauischen Wegeberichte”) крыніцах.

Але археалагічныя даследаванні апошніх 20 гадоў на тэрыторыі “усходняй Літвы” (гістарычнае Віленскае ваяводства) зрабілі сапраўдны прарыў у вывучэнні паселішчаў неаграрнага тыпу. Да аналізу такіх археалагічных комплексаў X—XIII стст., як Крэва і Гальшаны, а таксама з XIII ст. Кернаў і Вільня, не эфектыўна аперавань выключна такімі археалагічнымі паняццямі як “гарадзішча” і “могільнікі”. Наяўнасць комплексаў артэфактаў і планіровачных структур дазваляюць выходзіць на ўзровень аналізу сацыяльных, гаспадарчых і палітычных функцый названых паселішчаў з канца X і ў перыяд да XIII стст. уключна. Крэўскі і Гальшанскі комплекс могуць быць тут мадэльнымі. Крэўскае гарадзішча не можа быць аднесена да катэгорыі феадальнай сядзібы, бо мае выразныя прыкметы арганізацыі рамеснай вытворчасці. Паводле крыніц XIV ст. Крэва вядомае як цэнтр акругі і дамен вялікіх князёў літоўскіх (Альгерда і Ягайлы). З улікам характарыстыкі матэрыяльнай культуры і фартыфікацыйных асаблівасцяў гарадзішча можна сцвярджаць, што першапачатковае Крэва мела рысы паселішча раннегарадскога тыпу.

Па выніках аналізу археалагічнай інфармацыі паселішчаў раннегарадскога тыпу можна сфармуляваць яшчэ адну гіпотэзу – ранняя ўрбанізацыя ва Усходняй Літве павязана з працэсам пашырэння славянскай гандлёва-рамеснай прысутнасці ў гэтых цэнтрах. Пашырэнне гэтай прысутнасці, пачынаючы з першай паловы XI ст., можна пакуль што пазначыць дэфініцыяй “славянскай каланізацыі”. На дадзены момант складана вызначыць, ці былі гэтыя працэсы звязаныя з ваенна-палітычнай экспансіяй рускіх князёў, ці з палітыкай літоўскіх нобіляў. Магчыма, дзейнічалі гэтыя абодва працэсы, але на пачатковай стадыі, у XI ст., перавагу меў ваенна-палітычны фактар.

Што тычыцца тэрміналогіі, то варта разгледзець увядзенне / вяртанне дэфініцыі “протагорад” у дачыненні да найбольш ранняга этапу станаўлення адміністратыўна-арганізацыйных цэнтраў Усходняй Літвы X—XII стст.

## Спіс крыніц і літаратуры:

1. Булкин, В. А. Археологические памятники Древней Руси IX—X вв. / В. А. Булкин, В. И. Дубов, Г. С. Лебедев. – Ленинград: Изд-во ЛГУ, 1978. – 150 с.

2. Булкин, В. А. Гнездово и Бирка (К проблеме становления города) / В. А. Булкин, Г. С. Лебедев // Культура средневековой Руси. – Ленинград: Наука, 1974. – С. 11—17.

3. Ваганава, А. М. Умацаваныя феадальныя сядзібы XI—XIII стст. / А. М. Ваганава // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 3. – С. 43—44.

4. Ваганова, А. Н. Раннефеодальные замки на территории западных земель Руси / А. Н. Ваганова // Труды Первой Международной конференции «Начала Русского мира», 28—30 октября 2010 г. — Санкт-Петербург: Русско-Балтийский информационный центр «Блиц», 2011. – С. 266—271.

5. Дзярновіч, А. Крэўскі замак і старажытнае Крэва: праблемы датавання і культурныя асаблівасці / А. І. Дзярновіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 1. – С. 5—16.

6. Еремеев, И. И. Древности Полоцкой земли в историческом изучении Восточно-Балтийского региона: (очерки средневековой археологии и истории Псковско-Белорусского Подвинья) / И. И. Еремеев. – Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин, 2015. – 696 с.

7. Кошман, В. І. Паселішчы міжрэчча Бярэзіны і Дняпра ў X—XIII стст. / В. І. Кошман. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – 281 с.

8. Крыцук, Р. Нумізматычны матэрыял з раскопак мястэчка Крэва / Р. Крыцук // Крэва : Гісторыя, археалогія, культурная спадчына : зборнік навуковых артыкулаў / уклад. і навук. рэд. А. І. Дзярновіч; рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2019. – С. 261—264.

9. Куза, А. В. Малые города Древней Руси. / А. В. Куза. – Москва: Наука, 1989. – 168 с.

10. Куза, А. В. Укреплённые поселения / А. В. Куза // Древняя Русь. Город. Замок. Село. / Отв. ред. Б. А. Колчин. – Москва: Наука, 1985. –

С. 39—51.

11. Лебедев, Г. В. Эпоха викингов в Северной Европе и на Руси. / Г. В. Лебедев. – Санкт-Петербург: Евразия, 2005. – 639 с.

12. Массон, В. М. Экономика и социальный строй древних обществ: (в свете данных археологии) / В. М. Массон. – Ленинград: Наука, 1976. – 192 с.

13. Піваварчык, С. А. Сацыяльна-гістарычная тыпалогія гарадзішч Панямоння X—XIII стст. / С. А. Піваварчык ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі // Гістарычна-археалагічны зборнік. У 2 ч. – Мінск: Сантанас, 1993. – Ч. 2. – С. 93—108.

14. Платонова Н. И. Проблемы становления города в Северной Руси: заметки археолога / Н. И. Платонова // Studia Slavica et Balcanica Petropolitana. – 2019. – № 2. – С. 109—126.

15. Штыхов, Г. В. Средневековые города Беларуси и их предшественники (к проблеме восточнославянского протогорода) / Г. В. Штыхов // Вестник Полоцкого государственного университета. – Серия А: Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 2—6.

16. Dlugossi, Joannis. Annales seu cronicae incliti Regni Poloniae, liber decimus (1370—1405) / J. Dlegossi; Consilium ed. S. Gawęda et al.; textum recensuit et moderavit Danuta Turkowska; comment. Sbigneus Perzanowski. – Varsaviae: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1985. – 443 p.

17. Jankuhn, H. Haithabu, ein Handelsplatz der Wikingerzeit. / H. Jankuhn. – Neumünster: Karl Wachholtz Verlag, 1963. – 302 s.

18. Jankuhn, H. Typen und Funktionen vor- und frühwikingerzeitlicher Handelsplätze im Ostseegebiet. / H. Jankuhn. – Wien: Österreichische Akademie der Wissenschaften, 1971. – 39 s.

19. Scriptores rerum Prussicarum. Die Geschichtsquellen der preußischen Vorzeit bis zum Untergange der Ordensherrschaft. – Leipzig: S. Hirzel, 1863. – Bd. 2 / Hrsg. T. Hirsch, M. Töppen, E. Strehlke. – VI, 866 s.



**Іл. 1. Крэўскае гарадзішча. Выгляд з поўдня.**




**Іл. 2. Сітуацыйны план-схема размяшчэння Крэўскага гарадзішча.**







**Іл. 3. Крэўскае гарадзішча. Касцяны, шкляны, крэмнiевы і металічныя вырабы.**

**Іл. 4. Крэўскае гарадзішча. Вырабы з каляровых металаў.**



**Іл. 5. Крэўскае гарадзішча. Фрагмент шкляніцы XII—XIII стст. з гравіроўкай арабскай вяззю “сульс”.**

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| *Белявец В.* | Рэчы вельбарскага паходжання ў зборах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея | 3 |
| *Ганчарук І.* | Навуковая сістэматызацыя і даследаванне помнікаў рускай дробнай пластыкі з медзі XVIII – пач. XX стст. у ГДМГР | 15 |
| *Гаршкоў А.* | Вынікі археалагічных даследаванняў 2019 года на тэрыторыі г. Гродна | 22 |
| *Дзярновіч А.* | Матэрыяльная культура Крэўскага гарадзішча X – пачатку XIV стст. і праблема крытэрыяў паселішчаў раннегарадскога тыпу | 32 |
| *Калядзінскі Л.* | Ендова, брацiна, брацінка і тувал (да інтэрпрэтацыі некаторых керамічных вырабаў XVII ст. з паселішчаў Беларусі) | 46 |
| *Кобринец В.* | Ценовая составляющая кладов (по данным Актовых книг Гродненского земского суда 30-80 гг. XVI в.) | 59 |
| *Сідаровіч В.*<br>*Крыцук Р.* | Манетныя скарбы з Гарадзеншчыны ў зборы нумізматычнага кабінета БДУ | 73 |
| *Сідаровіч В.* | Медныя манеты Рымскай імперыі ў Гродзенскім Панямонні | 83 |
| *Талкачова Л.* | Да пытання паходжання і складу скарбу сярэдзіны XVII ст. з вёскі Раменікі (Іўеўскі раён) | 96 |
| *Тарасевіч В.* | Археалагічныя экспедыцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусі (1950-я – 2020 гг.): гістарычны агляд, сучасны стан і перспектывы | 105 |
| *Петухов А.* | Могилёвское церковное древнехранилище (1897 – 1918): судьбы сотрудников, коллекций, зданий | 116 |

| | | |
|---|---|---|
| *Пачобут Н.* | Рэнесансная кафля першай паловы XVI ст. з раскопак замка Беразавец у Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці | 123 |
| *Ціхаміраў А.* | Іўдзейскія рэлігійныя прадметы: сакральнасць у штодзённасці (на прыкладзе калекцый Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі) | 132 |